Газета экалагічнага гуртка «Прыроды і Мы»

# Экалагічная газета

Радунь

распаўсюджваецца бясплатна

№2 (1)

сакавік 2007

# Веснікі вясны



У залацістым бутоне цюльпана было заключана шчасце. Але не было такой сілы, якая магла б раскрыць гэты бутон. Аднойчы па лузе ішла жанчына з дзіцём. Хлопчык вырваўся з рук маці, са звонкім смехам падбег да кветкі, і залацісты бутон раскрыўся. Бясклопатны дзіцячы смех здзейсніў тое, чаго не магла зрабіць ніякая сіла. З той пары і павялося дарыць цюльпаны толькі тым, хто адчувае шчасце!



Асаблівыя адносіны складаюцца ў людзей да жоўтага колеру. Яго звязваюць са здрадай, развітаннем. Пра гэта гаворыць і ўсходняя легедна: чырвоныя кветкі выдалі няслушную жонку султана, пажаўцеўшы ў яе руках.

А вось ў культуры Японіі жоўты колер – гэта сімвал света і сонца, і жоўтыя мімозы там дораць толькі тым людзям, якім жадаюць света і дабра.



Каланхоэ называюць “хатнім доктарам”, “хірургам без нажа”, а яшчэ “кветкай Гёте” – менавіта гэты вялікі паэт адкрыў яго гаючыя ўласцівасці. Сок і мазь каланхоэ гояць раны, дапамагаюць пры запаленні дзёснаў, вачэй. У хірургіі каланхоэ выкарыстоўваюць пры перасадцы скуры. Дапамагае каланхоэ і пры прафілактыцы грыпа.



Старажытная легенда расказвае, што, калі Бог выгнаў з рая Адама і Еву, пайшоў снег. Ева вельмі змёрзла. У суцяшэнне ёй некалькі сняжынак былі ператвораны ў белыя кветкі пралескі. Змёрзлай Еве яны падаравалі надзею на хуткае пацяпленне. З той пары пралеску лічаць веснікам цяпла.

**Падрыхтавалі**
**Радута А., Шчэрбакова І., Янушкевіч В., Спецялюн Г.**

# Апытанне

Сярод настаўніц сярэдняй школы №2 г.п. Радунь карэспандэнтамі газеты праведзена наступнае апытанне:

**“Якія кветкі вам падабаюцца? З чым яны ў вас асацыіруюцца?”**

Большасць атрыманых адказаў пачыналіся так:

**“Падабаюцца ружы…”**

**Сальдюн А.С.**: “…, а дораць розныя кветкі”

**Ганевіч Г.Я.**: “…, але чайнага колеру”

**Русялевіч Ф.С.**: “…таму, што проста падабаюцца”

**Дакашэнка Я.А.**: “…жоўтага колеру. Гэта дабро і святло”

**Цевель Е.А.**: “…, але маленькія букецікі”

**Цілíндзь А.М.**: “…таму, што на 21-шы дзень народзінаў атрамала такую ж колькасць гэтых кветак у адным букеце. Ружы асацыіруюцца з дабрабытам”

**Мусік С.**: “…, але зохоўваюцца яны, нажаль, нядоўга”

А яшчэ?!

**Варатнікова В.В.**: “Мае любімыя кветкі – ландышы. Цяпло, святло, утульнасць, прыгажосць”

**Габіс Ф.Ф.**: “Вельмі люблю палявыя кветкі. Яны каштоўныя і самыя галоўныя, так як былі атрыманыя ўпершыню ад каханага чалавека”

**Станішэўская Т.Л.**: “Падабаюцца з кветак ліліі. Яны далікатныя і незвычайныя”

**Мусік С.**: “Ружы хутка марнеюць. Гваздзікі – мужчынскія кветкі. Люблю астры! Яны разнастайныя па колеру і памерах, вельмі ўстойлівыя”

**Святловіч Е.І.**: “Ландышы – першыя вясеннія кветкі, майскія. А я нарадзілася ў маі”

**Ганевіч Г.Я.**: “Самыя светлыя і шчырыя кветкі - рамонкі”

**Цевель Е.А.**: “З хатніх кветак люблю пальмы. А першыя кветкі – цюльпаны – атрымала ў шостым класе”

# Як пачаўся час?..

**Усё, што звязана з часам, звязана з узыходам і заходам сонца. Прамежак паміж імі людзі называюць “дзень”, а ўсе 365 дзён складаюць ў год. За гэты час адныя зоркі змяняюць другія на начным небе, а ў пагодзе адбываюцца сезонныя з’явы.**

### Як людзі прыдумалі каляндар?..

Старажытныя рымляне прыдумалі сістэму, якую людзі выкарыстоўваюць і ў сучасны час. Спачатку яны раздзялілі год на месяцы і далі некаторым з іх назвы. А пасля падзялілі месяцы на дні і далі кожнаму свой нумар, напрыклад, 1 верасня ці 25 мая.

### Юліанскі каляндар

Цяжкасці пры складанні календара звязаныя з тым, што год цягнецца не цэлую колькасць дзён, а прыкладна 365,25 дня. У 45 годзе да н.э. Юлій Цэзар вырашыў гэтую праблему і ўвёў каляндар, у якім пасля трох гадоў па 365 дзён ішоў 366-дзённы высакосны год.

### Грыгарыянскі каляндар

Праз пэўны час было палічана, што год цягнецца на 11 хвілін менш. Гэтая недакладнасць у Юліанскім календары была “выпраўлена” папай Грыгорыям XIII у 1582 годзе. Ен падпісаў загад, па якому дзень 5 кастрычніка трэба было лічыць 15 кастрычнікам. У працілеглым выпадку каляндарныя даты не супадалі б з парамі года.



Сонечны гадзіннік - першы, які ўжываўся людзьмі

Гэты каляндар выкарыстоўваецца ў некаторых заходніх краінах і ў сучасны час.

### Што такое суткі?..

Дзяліць час толькі на дні вельмі нязручна. Таму было вырашана падзяліць дзень на 24 гадзіны. Якія, ў сваю чаргу, падзяляюцца на 12 гадзін да поўдня і 12 гадзін пасля поўдня. Гэта дапамагло манахам адбываць свае малітвы ў пэўны час, маракам ведаць, калі ім стаяць на вахце, а калі адпачываць.

Людзі пайшлі яшчэ далей і разбілі час на 60 хвілін, а хвіліну на 60 секунд. Секунда – гэта самая маленькая часціца часу, якой мы карыстаемся ў паўсёдзённым жыцці.

**Падрыхтавалі
С. Алюк, Н. Міхалоўская, Я. Стэцкі, А. Казлоўскі**

# Пераход на “летні” час

**У нядзелю, 25 сакавіка, у 2.00 па мясцовым часе стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Беларусі пераводзяцца на адну гадзіну наперад.**

Ідэя “летняга” і “зімовага” часу пачынаецца з натуральнага імкнення чалавека ўставаць на світанку, каб максімальна выкарыстоўваць светлавы дзень.

Сумяшчэнне часу бадзёрасці са светлым часам сутак важна і для эканоміі электраэнергіі. Пры “летнім” часе чалавек вечарам значна пазней уключае святло. “Зімні” ж час да эканоміі электраэнергіі не прыводзіць, аднак, пераход на яго ажыццяўляецца для павышэння якасці жыцця чалавека. Перавод гадзіннікаў вясной і восенню эканоміць 1% электраэнергіі – некалькі мільярдаў кілават-гадзін.



Пераход на летні час адбудзецца ў 2.00 ночы

### Час – гэта грошы

Адным з першых ідэю пераводу гадзіннікаў для эканоміі энэргіі выказаў знакаміты амерыканскі навуковец і дзяржаўны дзеяч Бенжамін Франклін яшчэ ў 18 стагоддзі. Але тады да яго прапановы не прыслухаліся.

### Хто першы?

Пераход на “летні” і “зімовы” час адбываецца больш чым у 110 краінах. Упершыню ў свеце пераход на летні час адбыўся ў Англіі ў 1908 г. У Расіі – ў 1917 г., а з 1981 г. “летні” час пачаў рэгулярна дзейнічаць.

### Як прыстасавацца да “летняга” часу?

Каб паменшыць збоі арганізма, спецыялісты рэкамендуюць: 1. За 2 нядзелі да пераводу часу пачаць штодня ўставаць на некалькі хвілін раней. 2. Павялічыць час сну на працягу месяца (АСАБЛІВА ШКОЛЬНІКАМ І СТУДЭНТАМ!). 3. Псіхалагічна настроіць сябе, што гэта для вас не праблема, і працягваць займацца сваімі звычайнымі справамі.

**Падрыхтавалі
Д. Дубінец, Д.Мажэйка, Н. Бабніс, Я. Пятроўская**

Рэктар унівэрсытэта на ўступных іспытах запытваецца ў абітурыента:
- Скажыце, а чаму Вы вырашылі паступаць менавіта ў наш унівэрсытэт?
- Тата, не дуры галавы!

Экалагічная газета Радунь
Галоўны рэдактар: Гелена Белязюн
тэл. : 8-(01594)-23-8-06
Вёрстка: Дзмітрый Гупянец
Аб’ём: 1/4 умоўна друкаванага аркуша
Наклад 50 асобнікаў
Выдавец: Гелена Белязюн
Надрукаваны на абсталяванні выдаўца
Адрас рэдакцыі:
г.п. Радунь вул. Новікавай, 12
Нумар падпісаны ў друк: 25.03.2007